ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г.

28 ЛЮТАГА

ЧАЦВЕР

№ 7 (1271)

Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

## НАВІНЫ БДУ

### ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

прайшла ў студэнтаў хімічнага факультэта з маладымі вучонымі Інстытута фізіка-арганічнай хіміі АН БССР.

Старшыня савета маладых вучоных кандыдат хімічных навук І. П. Мардзіловіч расказаў студэнтам аб асноўных напрамках работы інстытута, аб дасягнутых поспехах у вывучэнні некаторых тэарэтычных пытанняў і значных народнагаспадарчых выніках, атрыманых у апошнія гады.

Пасля гэтага была праведзена экскурсія па лабараторыях, дзе студэнтам былі прадэманстраваны навейшыя ўстаноўкі для даследавання розных фізічных і фізіка-хімічных характарыстык.

Сустрэчы гэтыя карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў студэнтаў. У час іх юнакі і дзяўчаты пазнаюць шмат новага і цікавага. Акрамя таго, яны садзейнічаюць прыцягненню студэнтаў у навукова-даследчую работу, расшыраюць іх кругагляд.

**А. ВЕЧАР,**
**старшыня НСС хімфака.**

### СВЯТАМ ДРУЖБЫ

і інтэрнацыяналізму стаў вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі і студэнтаў супраць каланіялізму. Вечар адкрыла прэзідэнт савета дружбы універсітэта Першынг Сайд з Ірака. Перад прысутнымі таксама выступілі А. Армандо (Панама), Х. Мухамед (Ірак), П. Білал (Іярданія). Быў прыняты зварот студэнтаў БДУ да моладзі ўсяго свету. У ім сфармулявана палажэнне аб тым, каб ператварыць васьмідзесятыя гады ў гады перамогі нацыянальна-вызваленчага руху ў барацьбе супраць каланіялізму.

Пасля гэтага былі падведзены вынікі конкурсу агітплаката. Першае месца занялі студэнты з Конга. У заключэнне прагучаў канцэрт «Песня — супраць каланіялізму.

**А. КОЗЕЛ.**

### УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР

адбыўся на матэматычным факультэце, прысвечаны 62-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Апладысментамі сустрэлі прысутныя ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых выпускнікоў і цяперашніх супрацоўнікаў універсітэта. Выступілі ўдзельнік бітвы за Берлін М. Ц. Нічыпарэнка і У. З. Собалеў, які змагаўся з японскімі імперыялістамі. Ветэраны (а іх сярод саставу выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ каля 300 чалавек) расказалі аб гісторыі стварэння Чырвонай Арміі, аб якасных зменах Савецкай Арміі за 62 гады яе станаўлення.

**В. САБАЛЕЎСКІ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

# АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

НА САМАЙ ускраіне горада, побач са стромкім сасновым борам пралягла вуліца імя Курчатава. Яна носіць імя вядомага фізіка-атамшчыка, стваральніка першага ў Еўропе атамнага рэактара і першай у свеце прамысловай атамнай электрастанцыі. Пад нумарам першым на гэтай вуліцы — сучасны пяціпавярховы будынак — факультэт радыёфізікі і электронікі.

Увайшоўшы ў памяшканне, адразу адчуваеш крыху незвычайную атмасферу. Таропка праходзяць супрацоўнікі або студэнты. Спяшаюцца, быццам баючыся выпусціць думку з галавы і хутчэй узяць яе на аловак.

Шыльда на дзвярах. Усяго чатыры літары — «ГНДЛ». Гэта галіновая навукова-даследчая лабараторыя. Тут пануе творчая атмасфера. Зрэдку ўспыхвае экран асцылографа — высвечвае крывую сінусоіды. Ля пульта Яўген Іванавіч Ляўша — супрацоўнік лабараторыі. Ён адладжвае сваю прыладу — «Сінхронны аналізатар вібрацыі». Яна дазваляе з высокай дакладнасцю выявіць дэфекты на ранніх стадыях узнікнення

(Працяг на 2-й стар.).



## ВЫСТАЎКА ФІЛАТЭЛІСТАЎ

ЯНА АДКРЫТА на радыёфізічным факультэце і прысвечана 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Разнастайная калекцыя марак адлюстроўвае жыццё і актыўную дзейнасць У. І. Леніна па стварэнню Савецкай дзяржавы. Гэтыя маленькія «карцінкі» расказваюць аб вялікім жыцці правадыра. Маркі падабраны ў храналагічнай адпаведнасці з дзейнасцю Леніна. Асабліва шырока прадстаўлены маркі аб падрыхтоўцы да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Спачатку падабраны цэлы блок, прысвечаны рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, а потым адлюстроўваюцца кастрычніцкія падзеі 1917 года.

У стварэнні выстаўкі, аформленай з добрым густам, вялікая заслуга студэнта II курса радыёфізічнага факультэта Валодзі Прадалятчанкі.

**А. ВАСІЛЬКЕВІЧ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

**ПАЗЫЎНЫЯ СУБОТНІКА**

# ПАЧАТАК ЁСЦЬ!

**З гарачым адабрэннем сустрэў наш народ ініцыятыву масквічоў правесці 19 красавіка камуністычны суботнік, прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Працоўныя калектывы нашай краіны бяруць на гэты дзень павышаныя абавязацельствы, рыхтуюцца адзначыць «чырвоную суботу» высокаэфектыўнай і якаснай працай.**

Суботнік. Ён застанецца ў памяці студэнтаў 1-й групы трэцяга курса факультэта журналістыкі. У гэты дзень яны працавалі ў інтэрнаце № 7 на адным з алімпійскіх аб'ектаў сталіцы. Сваю ўдарную працу прысвяцілі знамянальнай даце ў жыцці савецкага народа — 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

У студэнтаў няма сыравіны, паліва, электраэнергіі, якія эканомяць рабочыя, каб працаваць, выкарыстоўваючы гэтыя матэрыялы ў дзень Усесаюзнага камуністычнага суботніка. Але ў іх ёсць маладзёжны запал, энтузіязм, якія заўсёды ёсць дзе прымяніць. І нікольні не засмучаў хлопцаў і дзяўчат той факт, што прыйшлося займацца ім зусім празаічнай справай — уборкай памяшканняў і пакояў інтэрната.

Хлопцы ўзялі на сябе нялёгкі, але пачэсны абавязак — перанеслі ўсе цяжкія прадметы: ложкі, тумбачкі, дзверы і г. д. Дзяўчатам нашым таксама сумаваць не было калі. Пакояў інтэрнацкіх, дзе патрэбны руплівыя дзявочыя рукі,— больш чым дастаткова. Пыл стаіць у калідорах, бы густы туман, а дзяўчаты не толькі шчыра працуюць... Якая ж работа без песні? І сапраўды, паяўляецца святочны настрой, калі, перакрываючы аднастайнае шорганне будаўнічых гэблікаў, да цябе даносіцца чысты дзявочы голас.

І можна зразумець камсорга групы Таню Азарэвіч, калі яна на адно-адзінае пытанне адказала адназначна, магчыма, дужа звыкла, але правільна і аб'ектыўна:

— Усе працуюць. Добра. Сумленна. Як на суботніку.

Услед за групай журналістаў на суботніку будуць працаваць іншыя факультэты. Хацелася б, каб і для іх гэты дзень па-сапраўднаму стаў святочным.

**М. ДАБЖЫНСКАЯ,**
**студэнтка III курса факультэта журналістыкі.**

# АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА

ФОТАРЭПАРТАЖ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

ў такіх складаных рухавіках, як, - напрыклад, авіяцыйныя. Над удасканаленнем гэтага прыстасавання Яўген Іванавіч працуе некалькі апошніх год. У 1978 годзе ён атрымаў за свае вынаходніцтва на ВДНГ СССР залаты медаль і два аўтарскія пасведчанні.

— Гэта лабараторыя, — расказвае старшы навуковы супрацоўнік Уладзімір Рыгоравіч Васіленка,— узнікла са студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі, дзе пасля заканчэння універсітэта заставаліся найбольш перспектыўныя студэнты. Тут яны працуюць над актуальнымі тэмамі, вынікі якіх потым укараняюцца ў народную гаспадарку краіны. Вось і цяпер мы разам са студэнтам V курса Уладзімірам Вярбіцкім распрацавалі прыладу для кантро-

(Заканчэнне на 3-й стар.).







# УВАГА: КОНКУРС!

САКРАТАРЫЯТ праўлення Саюза журналістаў БССР, калегія Міністэрства унутраных спраў рэспублікі, прэзідыум Рэспубліканскага савета таварыства аўтааматараў пастанавілі правесці конкурс на лепшае асвятленне пытанняў бяспекі руху газетамі рэспублікі.

Побач са штатнымі супрацоўнікамі рэдакцыі да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца работнікі ГАІ, прадстаўнікі грамадскасці, а таксама ўсе чытачы нашай газеты.

Матэрыялы, якія дасылаюцца на конкурс, будуць змешчаны пад спецыяльнай рубрыкай і эмблемай.

Для шматтыражных газет, якія атрымаюць перамогу ў конкурсе, устаноўлены наступныя прэміі: першая — 150 руб., другая — 125 руб., трэцяя — 100 руб. і тры заахвочвальныя прэміі па 50 рублёў. Пры гэтым 50 працэнтаў з адзначаных сум будзе выкарыстана для заахвочвання штатных супрацоўнікаў рэдакцыі і столькі ж — для ўзнагароды няштатных аўтараў, найбольш актыўна выступаючых з матэрыяламі на гэтую тэму.

ЯК ЖЫВЕШ, ІНТЭРНАТ!

# ПЕРААДОЛЬВАЮЧЫ ЦЯЖКАСЦІ

У ВЕСТЫБЮЛІ інтэрната № 6 было людна. Ён нагадваў будаўнічую пляцоўку. Дзесьці ў канцы калідора глуха і рытмічна стукаў малаток. Ідзе рамонт памяшкання. Імкнучыся перакрычаць мелодыю будоўлі, я звярнулася да дзяжурных з просьбай дапамагчы знайсці рабят са студсавета. Жэня Сенакосаў, старшыня жыллёва-бытавой камісіі, аказаўся побач, і праз несваю радыёгазету. Радыёперадачы выходзяць у эфір два разы ў тыдзень. Асабліва цікавыя былі тыя, што арганізаваны студэнтамі з ГДР аб музыцы іх краіны. Ажыўлена праходзяць пасяджэнні гуртка аматараў паэзіі, кіруе якім студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі Таццяна Міранчук.

Усё гэта добрыя пачынанні. Яшчэ на справаздачна-выбар-

калькі хвілін мы ўжо сядзелі на сёмым паверсе ў ленінскім пакоі.

Маімі субяседнікамі былі Аляксандр Сатолін — старшыня студсавета, Наталля Паўлава — старшыня культурна-масавай камісіі і Яўген Сенакосаў — старшыня жыллёва-бытавой камісіі.

Студэнцкі інтэрнат № 6 знаходзіцца ў некалькі выгадным становішчы ў параўнанні з астатнімі інтэрнатамі. Тут жывуць студэнты толькі двух факультэтаў: фізічнага і прыкладной матэматыкі. Таму няма неабходнасці ствараць некалькі пафакультэтных студсаветаў (як гэта мае месца ў іншых інтэрнатах БДУ) на чале з галоўным саветам інтэрната.

У саставе студсавета 21 чалавек. Сюды ўключаны старшыні ўсіх існуючых камісій, што дазваляе здзяйсняць пастаянны кантроль за іх дзейнасцю. З пачатку вучэбнага года актыўна ўзяўся за работу савет ленінскага пакоя. Але сутыкненне з аб'ектыўнымі цяжкасцямі наклала свой адбітак на стыль і якасць гэтай работы. Савет ленінскага пакоя абмяжоўваецца правядзеннем лекцый для нешматлікай аўдыторыі. Арганізоўваць масавыя лекцыі даволі складана ва ўмовах рамонту інтэрната. Студсаветам інтэрната было прынята рашэнне аб стварэнні дыспут-клуба па пытаннях ідэалогіі. Рашэнне прынята, але работа не пачата, хаця заслугоўвае значнай ўвагі.

Любяць студэнты інтэрната най камсамольскай канферэнцыі універсітэта была прынята пастанова аб стварэнні маладзёжнага кафэ-клуба. Студсавет вырашыў паспрабаваць арганізаваць такое кафэ ў сваім інтэрнаце, хаця справа гэта не простая. З пачатку навучальнага года ідзе падрыхтоўка памяшкання. Нарэшце, калі вырашана пытанне памяшкання, паўстае не менш важнае і складанае пытанне набыцця музычнай апаратуры. Планавыя тэрміны адкрыцця зрываюцца.

Пытанне ж стварэння кафэ-клуба ў інтэрнаце сапраўды наспела. Сюды студэнты маглі б прыйсці пагутарыць, паслухаць музыку, абмеркаваць надзённыя пытанні. Такім чынам, ёсць сэнс студсавету перагледзець пытанне падрыхтоўкі і адкрыцця клуба. Думаецца, што «Клуб аматараў навукі і мастацтва» — так будзе называцца кафэ — інтэрната № 6 прыме сваіх наведвальнікаў ужо ў гэтым навучальным годзе.

А пакуль рабяты з задавальненнем ходзяць на вечары, якія арганізуе студсавет, наведваюць гурткі, прымаюць удзел у спартыўных мерапрыемствах. І толькі зрэдку хтонебудзь можа паскардзіцца на цяжкасці гэтага навучальнага года, звязаныя з рамонтам інтэрната, з тэрміновай сесіяй, паскардзіцца на цяжкасці, але не на сум і нецікавасць інтэрнацкага быту.

**Т. САЛОДКАЯ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

НАШ КРУГЛЫ СТОЛ

# ПАД ЛЯЖАЧЫ КАМЕНЬ...

**СЁННЯ ў нас у гасцях намеснік старшыні мясцкома універсітэта Уладзімір Іванавіч Сілін, намеснік дырэктара трэста сталовых Маскоўскага раёна горада Мінска Вера Мікалаеўна Макарава, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы універсітэта Мікалай Якаўлевіч Ляпіла. Размова наша пойдзе аб вырашэнні пытанняў грамадскага харчавання ў БДУ імя У. І. Леніна.**

**У. І. Сілін:**

— Праблема, якую мы абмяркоўваем, вельмі важная таму, што ад таго, як чалавек харчуецца, у многім залежыць яго настрой, працаздольнасць працы і самае галоўнае — здароўе.

Мясцком універсітэта пытанням грамадскага харчавання ўдзяляе значную ўвагу. У нас створана спецыяльная камісія, якую ўзначальвае М. І. Юрчук. Шмат намаганняў прыкладае член камісіі М. І. Юзафовіч, які працуе ўжо не першы год над вырашэннем названай праблемы. Разам з тым сёння мы павінны спыніцца на нявырашаных пытаннях. Наша задача заключаецца не толькі ў тым, каб навучыць студэнтаў выбраным прафесіям, але і забяспечыць іх на працягу пяці год трохразовым танным і каларыйным харчаваннем. Але нярэдка выходзіць так, што замест таго, каб студэнт атрымаў страву, якая даступна яго «карману», ён вымушаны браць яе з венжанінай, каўбасой, селядцом.

Камісія народнага кантролю з акта ў акт піша адны і тыя ж заўвагі. Адсутнасць цэннікаў і меню, не хапае малочных страў і гароднiны. Пры сервіроўцы сталоў, як правіла, адсутнічаюць гарчыца, перац, сурвэткі...

**В. М. Макарава:**

— Сапраўды, гэтыя факты даволі часта маюць месца ў рабоце студэнцкіх сталовых. Што датычыць сервіроўкі сталоў, то заўвага правільная. Недахоп страў — гэта ўжо абыякавыя адносіны да справы работнікаў сталовых. Пытанні такога характару патрэбна ставіць перад адпаведнымі органамі, у даным выпадку перад загадчыцамі сталовых. Але мы павінны памятаць і пра тое, што прадукты, намі набытыя, у пэўны тэрмін патрэбна рэалізаваць...

У сваю чаргу ў нас ёсць свае патрабаванні да работы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта. На працягу вось ужо некалькіх год запар мы не маем патрэбнага абсталявання для прыгатавання закусак.

**М. Я. Ляпіла:**

— Кожны год, у верасні, мы павінны мець заяўкі ад усіх падраздзяленняў універсітэта на набыццё таго ці іншага абсталявання. Але з-за абыякавых адносін В. В. Кулікова да сваёй справы (загадчыцы сталовай № 33) гэтыя заявы ў тэрмін не прадстаўлены. А пытанне ўзнікае толькі тады, калі камісія народнага кантролю запіша ў акце аб дрэннай рабоце вентыляцыі ці абсталявання. А каб раней паклапаціцца аб стварэнні нармальных умоў абслугоўвання персаналу — пра гэта В. В. Кулікова забывае.

**У. І. Сілін:**

— У памяшканні сталовай галоўнага корпуса ў часы «пік» абслугоўванне праходзіць вельмі марудна. Таму, нам здаецца, настала неабходнасць устаноўкі другога касавага апарата, каб павысіць прапускную здольнасць.

У інтэрнаце № 4 на Паркавай магістралі буфет працуе ад рэстарана «Нарач», дзе кошт прадуктаў харчавання для студэнтаў не зусім «студэнцкі».

**В. М. Макарава:**

— Паскорыць хуткасць абслугоўвання ў сталовай галоўнага корпуса ўстаноўкай другога касавага апарата не прадстаўляецца магчымым, таму што па прынятых нормах на 85 пасадачных месц патрэбен адзін апарат.

Мясцкому разам з іншымі грамадскімі арганізацыямі патрэбна хадайнічаць перад адпаведнымі органамі, каб кропкі грамадскага харчавання БДУ імя У. І. Леніна падпарадкоўваліся аднаму трэсту. Тады б не ўзнікала праблем з буфетам у інтэрнаце № 4 і сталовымі ў Шчомыслiцах.

**М. Я. Ляпіла:**

— На мой погляд, у вырашэнні пытання з буфетам у інтэрнаце № 4 можа сыграць не апошнюю ролю прафком юрыдычнага факультэта, паколькі вядучую ролю ў інтэрнаце займаюць юрысты. На будучае мы плануем пераабсталяваць пад памяшканне сталовай стары фізічны корпус, а сталовая галоўнага корпуса будзе абслугоўваць толькі выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

**У. І. Сілін:**

— Вось ужо на працягу некалькіх гадоў вырашаецца пытанне адкрыцця стала заказаў для выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Зараз мы з упэўненасцю можам сказаць, што пытанне гэта ў хуткім часе будзе вырашана. Ужо адрамантавана памяшканне, зроблены план размяшчэння і набыта неабходнае абсталяванне. Хочацца выказаць упэўненасць, што доўгачаканыя надзеі выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта нарэшце збудуцца.

**Каментарый журналіста:**

**— Як бачым, праблем у грамадскім харчаванні нямала. І вырашаць іх патрэбна сумеснымі намаганнямі ўсіх грамадскіх арганізацый. У першую чаргу сваё важкае слова павінны сказаць людзі, якія ўзначальваюць групу народнага кантролю, камісію грамадскага харчавання — усе тыя, хто мае прамое дачыненне да гэтай праблемы. І не толькі сказаць, а канкрэтнай справай здзейсніць свае планы на практыцы. Бо, як вядома, пад ляжачы камень вада не бяжыць...**

**В. ШАЎЧУК,**
**спец. кар. газеты «Беларускі універсітэт».**

ГІСТАРЫЧНЫ ЛЕТАПІС

# СПРАВА КОЖНАГА

САВЕЦКІ народ уступіў у новае дзесяцігоддзе, пачатак якога азнаменаваны велічнымі датамі ў гісторыі нашай краіны — 110-й гадавінай з дня нараджэння У. І. Леніна і 35-годдзем з Дня Перамогі. Рыхтуючыся да гэтых знамянальных дат, кожны савецкі чалавек імкнецца ўнесці свой пачэсны ўклад у велічную справу будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Студэнцкі і выкладчыцкі ўклад у агульнаграмадскую справу заключаецца не толькі ў трывалым засваенні ведаў і павышэнні прафесіянальнага майстэрства, але і ў распрацоўцы, накапленні багацейшага фактычнага матэрыялу з сучаснасці і мінулага для наступных пакаленняў, у стварэнні багажу для будучых нашчадкаў, пісьменнікаў, журналістаў, даследчыкаў, гісторыкаў, краязнаўцаў і іншых зацікаўленых асоб.

Кожнаму з нас, як і мільёнам прагрэсіўных людзей свету, дорага імя У. І. Леніна. І чым далей адыходзіць час, тым даражэй для нас нават маленькая дэталь, якая характарызуе Леніна не толькі як правадыра рэвалюцыі і працоўных людзей, але і як чалавека і бясконца любімага таварыша. Нам становіцца больш вядома пра ленінскую незгасальную энергію, жалезную логіку, сціпласць, дакладнасць нават у дробязях з успамінаў тых людзей, хто меў шчасце бачыць і чуць вялікага правадыра, працаваць і жыць побач з Уладзімірам Ільічом. Значная колькасць такіх успамінаў была абнародавана да 100-годдзя з дня нараджэння Леніна. Многія запісаныя раней вусныя апавяданні пра Леніна з'яўляюцца зараз гістарычнымі дакументамі, паколькі расказчыкаў іх зусім нядаўна не стала. А ад некаторых людзей, хто часта сустракаўся з Уладзімірам Ільічом, сучаснікі не паспелі запісаць ніводнага слова. Таму так неабходна зараз спяшацца запісваць вусныя расказы ветэранаў ленінскай партыі, былых чырвонагвардзейцаў, удзельнікаў рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Гэта велізарная і адказная работа можа быць пад сілу толькі вялікаму калектыву людзей. Нам думаецца, што шматтысячны калектыў нашага універсітэта можа шырэй падключыцца да гэтай важнай і пачэснай справы і прыняць удзел у стварэнні рэспубліканскага «Летапісу народнай славы». Для гэтага велічнага дакумента эпохі прыйдзецца запісаць шмат расказаў ад усіх відавочцаў гістарычных падзей. «Ні адно імя воіна, партызана, падпольшчыка, ні адно імя жанчыны або дзіцяці, якія сталі ахвярай фашызму, не павінна быць абыдзена, прапушчана або забыта», — падкрэсліў у сваёй прамове на XXVI з'ездзе ЛКСМБ кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў. Ён далей адзначыў, што «гэта будзе сапраўды народны летапіс самога народа аб сваіх гераічных справах. Няхай праз гэту высакародную з усіх работ пройдзе цэлае пакаленне моладзі і навучэнцаў. Мы ўпэўнены, што нашы юнакі і дзяўчаты, сутыкнуўшыся з жывой гісторыяй подзвігу і самаахвяравання сваіх бацькоў і дзядоў дзеля жыцця на зямлі, стануць яшчэ больш высакароднымі, яшчэ чысцейшымі і больш мужнымі».

Гэтыя выказванні Пятра Міронавіча пераконваюць яшчэ глыбей, калі сапраўды сустракаешся з жывымі сведкамі падзей або чытаеш іх успаміны ці такія кнігі, як «Я з вогненнай вёскі», складзеная А. Адамовічам, Я. Брылём і У. Калеснікам.

У апошнія гады з дапамогай студэнтаў-філолагаў і журналістаў стацыянара і завочнага факультэта нам удалося адшукаць былых удзельнікаў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны і запісаць на магнітную стужку пэўную колькасць вусных апавяданняў пра Леніна. Такія запісы былі зроблены студэнтамі ў час фальклорнай практыкі і ў індывідуальным парадку па нашай просьбе. Асаблівую цікавасць уяўляюць вусныя апавяданні: Г. К. Ярмаловіча з Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці, які ў паслярэвалюцыйныя час служыў у Маскве і бачыў Леніна, чуў яго выступленні; П. І. Федасеева—былога крамлёўскага курсанта, які зараз жыве ў Ленінградзе. Гістарычнымі дакументальнымі запісамі з'яўляюцца зараз успаміны ганаровага грамадзяніна горада Чачэрска Гомельскай вобласці М. К. Юльскага і дэлегата III з'езда камсамола І. А. Разанава і інш. Гэтых людзей няма зараз у жывых.

У пачатку лютага гэтага года мы наведалі Рэспубліканскі пансіянат персанальных пенсіянераў, што знаходзіцца ў Ждановічах. Там зараз жывуць многія вядомыя людзі рэспублікі. Некаторыя з іх, як, напрыклад, В. В. Кундовіч, С. І. Герасімовіч, А. І. Лапекін, падзяліліся ўспамінамі пра далёкія рэвалюцыйныя гады, пра велічныя падзеі ў нашай краіне. Асабліва кранулі нас іх расказы пра сустрэчу з Леніным. Гэтыя сустрэчы былі некалькі мінут, але запомніліся ім на ўсё жыццё. У пансіянаце мы даведаліся і пра іншых ветэранаў партыі, якім не раз даводзілася бачыць Уладзіміра Ільіча, весці з ім гутарку. Але, на жаль, нам не ўдалося запісаць ніводнага іх слова, бо некаторыя з іх зараз цяжка хворыя, а такія, як М. З. Сціпанаў, Я. Г. Ракаў, А. І. Кажанкоў, нядаўна памерлі. Але яны пакінулі свае пісьмовыя ўспаміны. На падставе гэтых запісаў, як і некаторых іншых, Інстытут гісторыі АН БССР падрыхтаваў да выдання зборнік пад назвай «Слова ленінскай гвардыі». Падобныя зборнікі і асобныя артыкулы-успаміны даюць больш глыбокае ўяўленне пра падзеі таго часу, раскрываюць вобразы кіраўнікоў Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і велічныя здзяйсненні нашага народа ў цяжкія гады для Краіны Саветаў.

Але колькі б ні выдавалася зборнікаў успамінаў, асобных запісаў, яны не могуць ахапіць усенародную памяць пра вялікія выпрабаванні, што выпалі на долю савецкіх людзей у гады рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. А відавочцаў гэтых падзей з кожным годам становіцца ўсё менш і менш. Пакідаючы нас, яны ўносяць неацэнны скарб успамінаў і боль свайго сэрца. Сучаснікі не павінны ўпусціць магчымасці запісаць усё гэта і зберагчы для будучых пакаленняў, якія будуць удзячны за неацэнныя дакументы. Таму так важна зараз для стварэння летапісу рэспублікі накапіць шматлікую колькасць дакладных архіўных матэрыялаў, якія паступова будуць абнародаваны. Прычым запісы трэба рабіць як мага больш поўныя, і ў іх не павінна быць прыгладжвання, стылізацыі. Бо няўдала, павярхоўна запісаўшы расказ чалавека, мы можам назаўсёды страціць самую магчымасць запісаць. Перад пачаткам выступлення інфарматараў неабходна даваць разгорнутыя каментарыі пра самога чалавека і яго ўдзел у тых або іншых падзеях, пажадана свае тлумачэнні падмацоўваць гістарычнымі дакументамі.

Пры запісванні жывых расказаў варта карыстацца магнітафонам. Але магнітныя стужкі павінны быць адразу расшыфраваны—гэта значыць перапісаны тэксты на паперу.

Для больш глыбокага пазнання гісторыі роднага краю і разумення духоўнай культуры народа неабходна запісваць не толькі вусныя апавяданні пра мінулае, але і легенды, народныя паданні і сказы, звязаныя з гераічнай дзейнасцю савецкіх людзей і падзеямі далёкага мінулага, а таксама казкі і песні, прыказкі і прымаўкі, народныя жарты і загадкі, гістарычныя балады і прыпеўкі, замовы і павер'і, звычаі і абрады і іншае. Названыя жанры фальклору і вусныя апавяданні запісваюць студэнты-філолагі ў час фальклорных і дыялектычных практык. Але ж ці пад сілу ім адным тая задача, пра якую вядзецца гаворка? Безумоўна, не. Бо час практык даволі абмежаваны, а жыццё патрабуе весці велічны летапіс штодзённа ва ўсіх мясцінах нашай рэспублікі. У гэтай справе значную дапамогу акажуць студэнты-завочнікі ўсіх факультэтаў. Жывучы ў пэўнай мясцовасці, яны могуць сустрэцца з цікавымі людзьмі і запісаць ад іх успаміны і іншыя фальклорныя творы. У выяўленні такіх людзей ім пасадзейнічаюць партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя работнікі, супрацоўнікі мясцовых газет, работнікі школ і іншых навучальных устаноў, а таксама актывісты-краязнаўцы, якія ўваходзяць у састаў раённых камісій па канцэнтрацыі збірання матэрыялаў для «Летапісу народнай славы». Пэўныя заданні змогуць выканаць і студэнты стацыянара ў час канікул. Гэта ім увойдзе ў залік па грамадска-палітычнай практыцы. Але для такой работы, відаць, патрэбна адпаведнае распараджэнне рэктарата, парткома і камітэта камсамола. Тут можа ўзнікнуць пытанне, а хто ж будзе накіроўваць гэту справу ва універсітэце? Скажам адразу, што такі жывы дакументальны матэрыял, запісаны ад шырокай грамадскасці, пра падзеі мінулага, гістарычных асоб, відных дзеячаў нашай партыі, навукі і культуры, пра духоўныя здабыткі народа, проста неабходна мець у распараджэнні кафедр гуманітарных навук для выхавання студэнцкай моладзі і навукова-даследчай работы. Але для каардынацыі збіральніцкай працы студэнтаў, сістэматызацыі і публікацыі сабраных матэрыялаў пры філалагічным факультэце варта было б стварыць спецыяльную лабараторыю.

**В. КАЛАДЗІНСКІ,**
**выкладчык кафедры беларускай літаратуры,**
**Г. ПАЎЛОВІЧ,**
**студэнт філфака.**

# АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).**

лю вытворчасці зубчатых колаў. Яна дазволіць кантраляваць іх работу на хуткасцях да 100 абаротаў у секунду. Каб даказаць карысцнасць нашых намаганняў, дастаткова сказаць, што пакуль існуючыя прылады такога тыпу дазваляюць рабіць кантроль на хуткасцях да $^{1}/_{15}$ абарота ў секунду.

...Ідуць заняткі ў шматлікіх лабараторыях факультэта. Тэарэтычныя веды вельмі важныя, але без практыкі сучасны студэнт — заўтрашні інжынер—не зможа ўпэўнена адчуваць сябе на вытворчасці або ў навукова-даследчым інстытуце. Таму і не пустуюць лабараторыі — курсавыя, лабараторныя, дыпломныя праекты. Дзень за днём, гадзінамі ўпартай працы спасцігаюць студэнты складаную і такую важную ў наш час навуку — радыёфізіку.

**А. СТАДУБ,**
**наш спец. кар.**
**Фота аўтара.**








## У добры шлях!

**ДЗЕНЬ ДОБРЫ, даражэнькія! Кафедра сатырычнага і гумарыстычнага аналізу (КГ і СА) катэгарычна вітае ўсіх вас, сябры ўсмешак і жартаў, і з вялікай нецярплівасцю запрашае на першае ў гэтым годзе пасяджэнне кафедры, якая пасля працяглага творча-абмеркавальнага часу зноў прымаецца за сваю справу. Вельмі шкодную і небяспечную. Бо, як вядома, кожная хвіліна смеху падаўжае жыццё толькі таму, каго смяшаць, і скарачае яе, у адпаведнай прапорцыі, таму, хто смяшыць. З гэтай прычыны на кафедры сатырычнага і гумарыстычнага аналізу распрацоўваецца і ўдасканальваецца новая сістэма заахвочвання. За кожную ўсмешку чытача ці недарэчны рогат самыя актыўныя, самыя знаходлівыя і вострасловыя члены кафедры ўзнагароджваюцца моцным поціскам рукі з боку жартаўнічага савета КГ і СА. Так што, даражэнькія, смейцеся. І чым больш, тым лепш і для вас, і для нас. А калі ўзнікнуць прапановы ці паявіцца жаданне далучыцца да нас, хуценька, каб не траціць марна часу, збірайцеся і прыходзьце. Чакаем!**

**ЖАРТАЎНІЧЫ САВЕТ КГ І СА.**

**ФАНТАСТЫКА**

# ЭКЗАМЕН

— ПРЫВЕТ! — павітаўся Федзькін з экзаменатарам і ўважліва зірнуў на яго твар. Ён быў страшэнна абыякавы і неяк падазрона блішчаў. «Які непрыемны», — з жахам падумаў Федзькін і зрабіў сумны вывад: «Напэўна, новая сістэма. Як ўжо надакучылі гэтыя эксперыменты».

— Дзень добры! — спыніў думкі Федзькіна экзаменатар і суха скрыпнуў:

— Прозвішча?

— Федзькін, — адказаў Федзькін і моўчкі націснуў маленькую чырвоную кнопачку на вялікім блакітным пульце. Недзе збоку замільгала лямпачка, і праз некалькі хвілін з вузенькага металічнага акенца вужакай выпаўз кавалак бялюткай паперы. Гэта быў білет. Федзькін зірнуў на яго і адразу спахмурнеў.

— Я не ведаю гэтых пытанняў, — пасля цяжкага ўздыху прызнаўся ён. — І наогул, я не падрыхтаваўся.

Лямпачка перастала міргаць і засвяцілася роўным жоўтым светам.

— Чаму? — яшчэ больш абыякава запытаўся экзаменатар.

— Таму што... — Федзькін нерашуча пачухаў патыліцу. — Толькі што я... закахаўся...

— Чаму? — зноў запытаў экзаменатар. Здавалася, што ён не зразумеў прызнання Федзькіна.

— Чаму-чаму... Сустрэў дзяўчыну і закахаўся. — Федзькін узрушана шмыгнуў носам.

— Дрэнна! — перабіў яго экзаменатар.

— Што дрэнна? Што закахаўся? А вы самі калі-небудзь кахалі? — Федзькін адчуў, што калі зараз яго словы не дойдуць да свядомасці экзаменатара, то яму не атрымаць ніякай станоўчай адзнакі. Але ён памыліўся.

— А што гэта такое, каханне? — нечакана запытаў экзаменатар.

— Вельмі доўга тлумачыць. Ды і навошта. Вы ж такі адукаваны, такі разумны. Вы павінны гэта ведаць.

— Гэтага няма ў маёй праграме, — пажаліўся экзаменатар. — Гэтага няма ў маёй праграме... Гэтага ня...

...Праз некалькі хвілін Федзькін ужо выходзіў з аўдыторыі і на пытанні сваіх аднакурснікаў адказваў толькі адно:

— Не вытрымаў. Згарэў. Сістэма нейкая недасканалая. Звычайных рэчаў не ведае...

**Лабарант ПІСУЛЬКІН,**
**в. а. загадчыка кафедры.**

**МАЛЮНАК З НАТУРЫ**

# НАГРУЗКА

ЖЫВЁМ МЫ ДОБРА ў сябе на кафедры. Электрыфікаванасць, механізаванасць, уладкаванасць. Вось і метро, акурат, будуюць. Зазірнеш на будаўнічую пляцоўку, дык ажно душа напаўняецца нечым лагодным і радасным. Толькі, праўда, неяк няўтульна дзыкаюць і грукацяць магутныя матory ды агарожу з літарай «М» трэба абыходзіць амаль за кіламетр, каб папасці з галоўнага корпуса універсітэта ў геаграфічны. Але нічога. Гэта часова.




Дык вось, зайшоў я неяк нядаўна, здаецца, на мінулым тыдні, да свайго сябра, які вучыцца на геафаку. Кажу яму, што ходзяць чуткі, быццам з-за гэтага метрабудаўніцтва географы зусім ад універсітэта адарваны, нават і тэлефоны ў іх вучэбным корпусе не працуюць. «Глупства гэта ўсё,— смяецца сябар,—нічога мы не адарваны. Аб усім, што робіцца на іншых факультэтах, ведаем. А пра тэлефоны... Яны не дзейнічаюць толькі ў адной частцы корпуса, ды і там хутка запрацуюць. Бяры і звані куды хочаш. Нават цікавыя кніжкі ў нас прадаюць». Хапае мяне за руку і вядзе да кіёска. Зірнуў я на прылавак, браточкі мае, і ледзь не падскочыў ад радасці. «А. С. Пушкін» Тынянава, «Леў Талстой»... Ціхенька так ляжаць і чакаюць пакупнікоў. І ніякай чаргі не назіраецца. Дастаю гэта я грошы з кішэні і ўжо сабраўся было купіць кніжкі тыя, як мяне ветліва так папярэдзілі: «Толькі з нагрузкай» і працягнулі нейкую брашуру ў шэрай вокладцы. І нягледзячы на тое, што я чалавек нервовы і магу слова якое рэзкае сказаць, прыйшлося ўсё ж такі ўзяць. Бо нічога тут не зробіш. Не пакідаць жа Талстога каму-небудзь іншаму.

Пазаўчора прачытаў усё і ўзяўся за «нагрузку». Чытаю-чытаю, а нічога зразумець не магу. Там пра нейкія цагліны, растворы, краны і іншыя будаўнічыя прылады... Вось і думаю: мабыць, патрэбна занесці яе, гэтую брашуру, шаноўным будаўнікам метро. Там, напэўна, спатрэбіцца. А можа занесці яе да сябра, бо яму ў нагрузку далі «Дапаможнік пачынаючаму трусаводу»? Няхай пабудуе ўжо для сваіх гадаванцаў утульнае жыццё.

**Шура ШПОРА.**

**ПАСЛЯ РАЗМЕРКАВАННЯ**

# УРОК

У ГРЭНЛАНДЫІ білі гейзеры. Праз Курыльскія астравы перакатваліся магутныя хвалі цунамі. У пустынях Аўстраліі збіралі ежу абарыгены. А ў дзесятым «Б» пачаўся ўрок фізікі. Малады ружавашчокі выкладчык, які быў накіраваны ў школу адразу пасля заканчэння універсітэта, дрыготкім і хрыплым голасам паведаміў:

— Дзеці... Я ваш новы настаўнік. Буду выкладаць фізіку. Маё прозвішча Пётр Гвідонавіч Фрамтон. Перастаньце смяяцца! Дарослыя людзі. Нічога смешнага. Не Франтон, а Фрамтон. Праз «мэ». Хто не спадзяецца на сваю памяць, няхай запіша. Ды не на парце. У сшытак.

Тэма сённяшніх заняткаў: «Аптычныя прылады і іх прызначэнне». Будзем выконваць разам і пад маім кіраўніцтвам.

Дзяжурны! Хто дзяжурны? Чаму няма дзяжурнага? Ёсць? Дзе? За дошкай стаіць? Ага. Ну-ну. Як прозвішча? Не чую. Гучней. Добра, Фокусаў, вазьміце гэтую скрынку. Ды не тую. Вось гэту з надпісам: «Асцярожна, не кантаваць!» Вось. І раздайце кожнаму па лупе.

Лупа—гэта такі аптычны прыбор, які дазваляе... Фокусаў, навошта вам малаток? Спачатку раздайце лупы. Скрынку потым адрамантуеце. Дык на чым гэта я спыніўся? А-а-а... Гэта такі прыбор, які дазваляе... Фокусаў, куды вы пайшлі? На калідоры вам нечага рабіць. Я казаў, кожнаму? Правільна, кожнаму ў класе, а не ва ўсёй школе. Завучу лупа не патрэбна. Ён і так усё бачыць.

Усе ўзялі лупу ў рукі. Паднеслі да вока. І... што мы бачым? Дзяўчынка ў чырвонай сукенцы, што вы робіце? Навошта тыкаць лупай у вока суседа? Гэта не манокль і не акуляры. Гэта каштоўны прыбор. Вам усё жартачкі, а ў мяне лупы лічаныя. Сорак штук. Пад распіску...

Усё. На сёння заняткі скончаны. Дзяжурнаму застацца і сабраць усе лупы. Ты чуеш, Фокусаў? Збярэш, і каб без фокусаў. Што? Не можаш? Прозвішча такое? Паглядзім.

Звініць званок. З класа выходзіць настаўнік. Следам за ім ідзе Фокусаў са скрынкай. Праз некалькі хвілін па школе грымоткім рэхам разносіцца нечалавечы крык Пятра Гвідонавіча Фрамтона. Пабіў, нягоднік! Усе лупы пабіў! Што зараз рабіць?!

А ў гэты час у Грэнландыі па-ранейшаму білі гейзеры. Праз Курыльскія астравы перакатвалася чарговая хваля цунамі. А ў пустынях Аўстраліі абарыгены знайшлі ежу і снедалі. Жыццё на зямлі працягвалася...

**Дацэнт НЕЗАЛІКІН.**

**ЛІРАНІЗМЫ**



# ДЗЕД І СТУДЭНЦКІ АБЕД

Дзед Хвядот займеў жаданне
З вёскі выбрацца у свет.
У студэнта-ўнука Вані
Пагасціць задумаў дзед.
Бабка выбрала гасцінцы
(Не хапае ў дзеда рук).
І, як бачым, у сталіцы
Сустракае госця ўнук.
А прыехаўшы здалёку,
Захацеў паснедаць дзед.
У студэнцкую сталоўку
За Іванам дзед ідзе.
Першым чынам дзве гадзіны
Дзеда мучыла чарга.
Моцны быў Хвядот на дзіва
І трымаўся як мага.
«І за што такія мукі?
Мусіць з голаду памру...»
Толькі дзед паднос у рукі,
А паднос ірвецца з рук.
Мокры, слізкі, як вужака,
Не ўтрымаць яго ніяк.
«Хоць паснедаю са смакам...»
Ды які там будзе смак!
Вось гайдаецца ў талерцы
Ці то муха, ці павук.
«Хай яго хлябаюць чэрці!
Пакарміў дзядулю ўнук...»
Толькі ў рот Хвядот катлету—
Хруснуў зуб і выпаў хлеб.
«Хай вас немач з ежай гэтай!
На бліны да бабкі мне б!»
Снедаць больш няма ахвоты,
Нават мёд не пойдзе ў рот.
Ёсць надзея для Хвядота—
Клункі выцягнуў Хвядот.
«Што тут баба надавала?—
Глянь, Іван, ды мы жывём!
Пакаштуй, унучак, сала.
Хочаш сала з часнаком?»

## СПОРТ

**У апошні час разам з такімі папулярнымі відамі спорту, як каратэ, бабслей, даміно, развіваецца і лёгкаатлетычны бег з перашкодамі. Цікава зазначыць, што разам з уменнем хутка бегчы і добра скакаць трэба ўмець і выдатна плаваць. Аб гэтым яскрава сведчыць адзін з момантаў спаборніцтваў (гл. малюнак) сярод юнакоў малодшай узроставай групы.**





## У СВЕЦЕ ЖЫВЁЛ

**Значных вынікаў па дрэсіроўцы катоў і іншых жывёлін дасягнуў студэнт біялагічнага факультэта Сяргей Ластаўкін. Зараз адзін з яго выхаванцаў, сібірскі кот па клічцы Плюмбум, якога вы бачыце на гэтым малюнку, праводзіць лабараторны дослед з сасудамі. Як бачна, дослед хутка закончыцца, і вучоны кот атрымае смачную ўзнагароду.**

# ДУМКІ ЎСЛЫХ

**СТУДЭНЦКІ ЗАКОН**

Самым найпершым значыцца
Гэты закон пацёрты:
Лепш ужо з «двойкай» знацца,
Чым сябраваць з «шасцёркай»!

**«АМАТАР» РОК-МУЗЫКІ**

Няважна: Бах
Ці «Абба»—
Абы
Ён модным быў:
І выгляд вабіў,
І ўдарнік біў...

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 15075 Заказ № 350.

28 лютага 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ